Падтрымай "Вясну" на PATREON

У Гомелі экс-міліцыянта асудзілі да трох месяцаў арышту за зліў дадзеных сваіх калегаў

23.11.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



Ілюстрацыйнае фота spring96.org

У судзе Савецкага раёна Гомеля 22 лістапада да трох месяцаў арышту паводле артыкула 203-1 Крымінальнага кодэкса (незаконныя дзеянні ў дачыненні да інфармацыі аб прыватным жыцці і персанальных дадзеных) асудзілі 30-гадовага былога міліцыянта Уладзіміра Кашко. Яго абвінавацілі ў зліве адміністратару Telegram-канала, які сёлета ўлады прызналі экстрэмісцкім, персанальных дадзеных 27 супрацоўнікаў міліцыі Гомельшчыны. Суддзя Андрэй Лагуновіч таксама пастанавіў спагнаць з гамельчука кампенсацыю маральнай шкоды пацярпелым 13 600 рублёў.

Уладзіміра Кашко абвінавацілі паводле часткі 1 і 2 артыкула 203-1 Крымінальнага кодэкса — наўмысныя незаконныя збор, прадастаўленне і распаўсюд інфармацыі аб прыватным жыцці і (ці) персанальных дадзеных іншай асобы без яе згоды, якія пацягнулі нанясенне істотнай шкоды правам,

свабодам і законным інтарэсам грамадзяніна. Гэта новы артыкул у Крымінальным кодэксе — ён з'явіўся ў крымінальным заканадаўстве толькі 26 траўня 2021 года. Адразу пасля ўнясенняў дадаткаў у Крымінальны кодэкс паводле гэтага артыкулу і распачалі крымінальную справу супраць гамельчука.

Паводле версіі абвінавачвання, мужчына *"са жніўня па студзень 2020 года сабраў з розных крыніц звесткі пра прыватнае жыццё 27 праваахоўнікаў Гомельскай вобласці і пераслаў іх нявызначанаму колу асобаў, што адмініструюць дэструктыўны Telegram-канал"*. Вялікая частка перададзенай ім інфармацыі была размешчаная ў стужцы Telegram-канала, які сёлета прызнаны экстрэмісцкім.

Паведамляецца, што абвінавачваны адпраўляў здымак супрацоўніка, пазначаў ягонае прозвішча, імя, імя па бацьку, месца працы, нумары тэлефонаў і спасылкі на старонкі ў сацыяльных сетках. Часам паведамляў дату нараджэння, дадзеныя пра асабісты транспарт і блізкіх сваякоў.

Пасля публікацый праваахоўнікам паступіла мноства тэлефанаванняў і паведамленняў, у тым ліку з абразамі і пагрозамі.

Паводле паказанняў абвінавачванага падчас следства, *"у перыяд перадвыбарнай прэзідэнцкай кампаніі ён зацікавіўся палітычнымі навінамі і падпісаўся на некалькі Telegram-каналаў, якія на цяперашні момант прызнаныя экстрэмісцкімі. Пад уздзеяннем размешчанага там кантэнту ў яго сфармавалася нянавісць да супрацоўнікаў міліцыі, якая вылілася ў супрацьпраўную дзейнасць"*.

Уладзімір Кашко раней працаваў тры месяцы міліцыятам у Дэпартаменце аховы. Праз некалькі гадоў ізноў вярнуўся на пасаду супрацоўніка патрульна-паставой службы, але праз чатыры гады яго звольнілі. З канца 2019 года ён не працаваў.




Уладзімір Кашко пасля затрымання

Як паведамілі ва УУС Гомельскага аблвыканкама, мужчына перапісваўся з адміністратарамі канала — абмяркоўваў з імі публікацыю звестак і магчымасць уцёкаў з краіны. Агулам ён зліў асабістыя дадзеныя больш як 20 калегаў, перапіску выдаляў, аднак у следства атрымалася яе аднавіць.


У выніку суддзя **Андрэй Лагуновіч** прызнаў Кашко вінаватым паводле ч.1 і 2 арт. 203-1 КК і прысудзіў яго да **трох месяцаў арышту**. Таксама суд пастанавіў спагнаць кампенсацыю маральнай шкоды пацярпелым у памеры **13 600 рублёў**.

Твитнуть










Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі трэмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі


Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны


Дайджэст вызваленых: 12 палітвязняў у сакавіку цалкам адбылі тэрміны і выйшлі на волю

"Могуць з'яўляцца злачынствамі супраць чалавечнасці". Што азначае гэтая фармулёўка ў дакладзе ААН пра Беларусь?

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023









ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK


















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY